Рэспубліканскае грамадскае
аб'яднанне
БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНСКІ
КАМІТЭТ

СТАТУТ ПРЫНЯТЫ НА УСТАНОЎЧЫМ
АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ

"11" кастрычніка 1995 г.

КАМІТЭТ ЗАРЭГІСТРАВАНЫ
МІНІСТЭРСТВАМ ЮСТЫЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

"1" лістапада 1995 г.

ПАСВЕДЧАННЕ № 0568

# СТАТУТ
# БЕЛАРУСКАГА ХЕЛЬСІНСКАГА КАМІТЭТУ

9.01.1996г. открыт счет № 3015216690017 в гордирекции Белбизнесбанка г. Минска код 764
гл. бухг.

Мінск 1995 г.

СТАТУТ
Беларускага Хельсінскага Камітэту

I. Агульныя палажэнні

I. Беларускі Хельсінскі Камітэт (БХК) -- добраахвотная, незалежная, непалітычная грамадская арганізацыя. Сваю дзейнасць Беларускі Хельсінскі Камітэт ажыццяўляе на ўсёй тэрыторыі Беларусі ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб"яднаннях", а таксама іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і гэтым Статутам.

2. Беларускі Хельсінскі Камітэт з"яўляецца юрыдычнай асобай, мае ўласныя банкаўскія рахункі, пячатку, бланкі і сімволіку, якія зацвярджаюцца і рэгіструюцца ва ўстаноўленым законам парадку.

3. Справаводства Беларускага Хельсінскага Камітэту вядзецца ў адпаведнасці з заканадаўствам. Дакументацыя, вызначаная заканадаўствам, здаецца ва ўстановы Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь.

4. БХК паведамляе аб сваёй рэгістрацыі, ліквідацыі, або рэарганізацыі ў трохмесячны тэрмін у афіцыйным выданні (газета "Рэспубліка" або інш.).

5. Штаб-кватэра Беларускага Хельсінскага Камітэту знаходзіцца ў Мінску: 220072, г.Мінск, вул.Ф.Скарыны, I, пакой 228.

II. Мэта, задачы і спосабы дзейнасці

6. Галоўная мэта Беларускага Хельсінскага Камітэту -- абарона ў Беларусі правоў чалавека, дэкляраваных Хельсінскімі пагадненнямі, іншымі міжнароднымі дамовамі па правах чалавека.

7. Беларускі Хельсінскі Камітэт садзейнічае выкананню наступных задачаў:

-- арганізацыі сістэматычнага назірання за выконваннем пагадненняў аб правах чалавека ў Рэспубліцы Беларусь;

-- падрыхтоўкі справаздач, даследаванняў, артыкулаў і іншых матэрыялаў, якія складаюць інфармацыю пра становішча з выконваннем нацыянальнага заканадаўства і міжнародных пагадненняў аб правах чалавека ў Рэспубліцы Беларусь;

-- распаўсюджванню гэтых матэрыялаў у Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі;

-- арганізацыі не забароненых дзеючым заканадаўствам формаў грамадскай дзейнасці, звязаных з абаронаю правоў чалавека ў Беларусі;

-- прапагандзе дакументаў у падтрымку правоў чалавека.

8. Беларускі Хельсінскі Камітэт ажыццяўляе ўласныя мэты і задачы шляхам:

-- арганізацыі і падтрымання кантактаў з юрыдычнымі і фізічнымі асобамі як у Беларусі, так і за яе межамі, якія маюць дачыненне да абароны правоў чалавека;

-- стварэння інфармацыйнага банка дадзеных пра выпадкі парушэння правоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь;

-- арганізацыі незалежнай грамадскай юрыдычнай экспертызы заканадаўчых і падзаконных актаў Рэспублікі Беларусь на прадмет адпаведнасці пагадненням і заканадаўству аб правах чалавека;

-- прапаганды вопыта дзяржаўных і грамадскіх арганізацый іншых краін па абароне правоў чалавека;

-- арганізацыі абароны законных правоў фізічных і юрыдычных асобаў -- членаў БХК, а таксама іншых асобаў, звярнуўшыхся за дапамогай БХК, калі парушаюцца іхнія правы;

-- правядзення кангрэсаў, канферэнцый і іншых форумаў дзеля выканання статутных мэтаў і задач;

-- арганізацыі семінараў, лекцый, публічных выступленняў і іншых грамадскіх мерапрыемстваў, накіраваных на абарону правоў чалавека;

--выданне ўласнага перыядычнага органа;

-- уздзейнічання іншымі метадамі і спосабамі на стан грамадскай думкі ў галіне выконвання правоў чалавека ў межах існуючага заканадаўства.

## Ш. Сяброўства

9. Сябрам Беларускага Хельсінскага Камітэту можа стаць любы правадзейны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які прызнае дадзены Статут, пісьмова засведчвае сваё жаданне працаваць дзеля выканання мэтаў і задач Беларускага Хельсінскага Камітэту. Дапускаецца сяброўства грамадзян іншых краін і асобаў без грамадзянства.

Акрамя таго, членамі БХК могуць быць юрыдычныя асобы, якія садзейнічаюць выкананню статутных мэтаў і задач, дзейнічаюць праз сваіх прадстаўнікоў. Прадстаўнікі юрыдычнай асобы прымаюць удзел у рабоце БХК на падставе службовых паўнамоцтваў або даверанасці.

10. Прыём у сябры Беларускага Хельсінскага Камітэту ажыццяўляецца на падставе заявы, якая разглядаецца Агульным Сходам Беларускага Хельсінскага Камітэту з прысутнасцю сяброў не меньш за 2/3 ад спісачнага складу, простай большасці галасоў. У прамежках паміж Агульнымі

сходамі рашэнне аб прыёме ў Беларускі Хельсінскі Камітэт можа прымаць Рада. Рашэнне Рады зацвярджаецца Агульным сходам.

II. Выхад з Беларускага Хельсінскага Камітэту вольны, афармляецца на падставе заявы сябра БХК. За цяжкія ці сістэматычныя парушэнні Статута Беларускага Хельсінскага Камітэту Рада мае права прыпыняць сяброўства па прапанове Старшыні ці трох сяброў Рады. Рашэнне Рады зацвярджаецца Агульным сходам. Сяброўства спыняецца з дня, вызначанага ў заяве альбо ў рашэнні Рады пасля зацвярджэння Агульным сходам.

I2. Сябру Беларускага Хельсінскага Камітэту выдаецца пасведчанне ўстаноўленага ўзору, знак з эмблемай БХК. Сакратар БХК вядзе ўлік дакументаў сяброў Беларускага Хельсінскага Камітэту.

I3. Сябра Беларускага Хельсінскага Камітэту мае права:

-- абраць і быць абраным у выбарныя органы БХК;

-- удзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах БХК;

-- атрымліваць неабходную інфармацыю ад Сакратарыята і Старшыні Рады Беларускага Хельсінскага Камітэту па дзейнасці арганізацыі;

-- карыстацца архівам БХК.

I4. Сябра Беларускага Хельсінскага Камітэту абавязаны:

-- выконваць Статут БХК;

-- браць удзел на пасяджэннях Агульнага сходу БХК. Адсутнасць на2-х Агульных сходах без важкіх падстаў з"яўляецца чыннікам пытання аб выключэнні з сяброў БХК;

-- выконваць рашэнні, прынятыя Агульным сходам і Радай БХК.

## IУ. Арганізацыйная структура

I5. БХК можа ствараць свае арганізацыйныя структурныя аддзяленні, якія ўтвараюцца па тэрытарыяльнаму прынцыпу пры наяўнасці ў раёне (горадзе), іншай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі рэспублікі трох яго членаў.

Усе аддзяленні роўныя паміж сабою.

Структура выбарных органаў і формы работы аддзялення вызначаюцца іх вышэйшымі органамі -- сходамі. Аддзяленні маюць тыя ж мэты і задачы што і БХК, і дзейнічаюць у адпаведнасці з гэтым Статутам.

I6. Вышэйшым органам Беларускага Хельсінскага Камітэту з"яўляецца Агульны сход. Кіруючым органам паміж сходамі з"яўляецца Рада. Пры Радзе ствараецца Назіральны Сойм, які выконвае дарадчыя функцыі.

I7. Агульны сход:

-- прымае рашэнні па ўсіх пытаннях, звязаных з дзейнасцю БХК;

-- выбірае Раду, Назіральны Сойм і Кантрольную Камісію БХК;

-- выбірае Старшыню і Сустаршыню БХК;

-- штогод разглядае справаздачу аб дзейнасці Рады і Кантрольнай Камісіі, а таксама Старшыні БХК;

-- заслухоўвае інфармацыю Кантрольнай Камісіі аб выдаткаванні фінансавых сродкаў не радзей 2-х разоў на год;

-- прымае рашэнні аб прыёме і выключэнні з сяброў БХК;

-- уносіць змены ў Статут;

-- прымае рашэнне аб спыненні дзейнасці БХК і яго ліквідацыі;

-- разглядае іншыя пытанні адносна дзейнасці БХК.

I8. Агульны сход лічыцца правадзейным пры прастой большасці прысутных сяброў (50%), калі спісачны склад своечасова інфармаваны аб скліканні Агульнага сходу, што пацвярджаецца Сакратаром Рады, акрамя тых пунктаў парадку дня, якія агавораны п.20 дадзенага Статута.

I9. Агульны сход прымае рашэнні простай большасцю галасоў па ўсіх пытаннях, акрамя тых выпадкаў, якія агавораныя п.20. Для вырашэння гэтых пытанняў патрэбна большасць у 2/3 галасоў прысутных на сходзе.

20. Пытанні аб зменах у Статуце БХК, выбарах Рады, Старшыні і Сустаршыні, прыняцці альбо прыпыненні сяброўства ў БХК, спыненні дзейнасці ці ліквідацыі БХК вырашаюцца толькі ў прысутнасці не меньш за 2/3 сяброў са спісачнага складу БХК.

2I. Агульны сход склікаецца па прапанове Рады БХК, Старшыні або Сустаршыні не радзей аднаго разу ў чатыры месяцы.

22. Рада Беларускага Хельсінскага Камітэту:

-- кіруе дзейнасцю БХК на падставе рашэнняў Агульнага сходу;

-- плануе працу БХК;

-- кіруе маёмасцю БХК (фінансавыя выдаткі коштам больш за I00 долараў ЗША абавязкова павінны быць зацверджаны Радай БХК);

-- абмяркоўвае і прадстаўляе Агульнаму сходу пытанні аб выключэнні з сяброў БХК;

-- вызначае Парадак дня Агульнага сходу;

-- зацвярджае штогадовую справаздачу Агульнаму сходу;

-- зібірае Сакратара БХК са складу сяброў БХК;

-- разглядае іншыя пытанні ў межах сваёй кампетэнцыі.

23. Рада БХК выбіраецца на два гады па рашэнню Агульнага сходу і можа складацца з 5-ці але не больш 7-мі сяброў БХК.

24. Рада БХК склікаецца не радзей I разу ў два месяцы. Пасяджэнне Рады лічыцца правадзейным пры наяўнасці больш за палову сяброў Рады.

25. У асобных выпадках Старшыні Рады БХК дазваляецца вырашаць пытанні шляхам тэлефоннага апытання сяброў Рады БХК з афармленнем пратаколу.

26. Старшыня Рады БХК:
-- прадстаўляе БХК;
-- кантралюе выкананне рашэнняў Агульнага сходу і Рады БХК, рыхтуе і вядзе пасяджэнні Агульнага сходу БХК;
-- рыхтуе і вядзе пасяджэнні Рады БХК;
-- мае права самастойна прымаць рашэнні аб выдаткаванні фінансаў даI00 долараў ЗША;
-- рыхтуе штогадовую асабістую справаздачу Радзе і Агульнаму сходу БХК;
-- кантралюе падрыхтоўку штогадовай справаздачы Рады Агульнаму сходу БХК;
-- прымае рашэнні аб прыёме на працу і звальненні з працы тэхнічных супрацоўнікаў БХК, заключае працоўныя пагадненні, вырашае памеры і форму ўзнагароды за працу, зробленую па заказах БХК у межах існуючага заканадаўства;
-- захоўвае пячатку і бланкі БХК;
-- вядзе прыём грамадзян.

27. Старшыня БХК атрымлівае заработную плату са сродкаў БХК, памер якой вызначае Агульны сход.

28. Фінансавую дзейнасць Старшыні БХК кантралюе Кантрольная Камісія, перад якой Старшыня робіць справаздачу раз у тры месяцы (пакварталына).

29. Старшыня БХК выбіраецца Агульным сходам тэрмінам на 2 гады кваліфікаванай большасцю галасоў (2/3).

30. Старшыня БХК валодае правамі і паўнамоцтвамі кіраўніка юрыдычнай асобы, з"яўляецца матэрыяльна адказнай асобай БХК.

3I. Сустаршыня -- нам.старшыні Беларускага Хельсінскага Камітэту:
-- прадстаўляе БХК у адсутнасці Старшыні або па рашэнні Рады;
-- кантралюе выкананне рашэнняў Агульнага сходу і Рады БХК;
-- вядзе пасяджэнні Агульнага сходу і Рады ў адсутнасці Старшыні;

-- мае права склікаць Агульны сход, Раду БХК;
-- мае права кантраляваць фінансавую дзейнасць Старшыні;
-- кантралюе дзейнасць сакратара БХК;
-- рыхтуе штогадовую справаздачу Рады Агульнаму сходу;
-- вядзе прыём грамадзян.

32. Сустаршыня БХК мае права другога подпісу ў банку.

33. Сустаршыня БХК выбіраецца Агульным сходам на 2 гады.

34. Сакратар Беларускага Хельсінскага Камітэту:
-- абіраецца Радай БХК;
-- вядзе пратаколы Агульнага сходу і Рады, а таксама іншую дакументацыю;
-- кантралюе дзейнасць тэхнічных работнікаў БХК, асабіста адказвае за збор і захоўванне архіва БХК, вядзе ўлік сяброў БХК;
-- вядзе перапіску БХК;
-- выконвае іншыя даручэнні Старшыні і Сустаршыні БХК;
-- вядзе прыём грамадзян у адсутнасці Старшыні і Сустаршыні БХК;
-- прадстаўляе БХК у межах сваіх паўнамоцтваў.

35. Сакратар БХК атрымлівае заработную плату за сваю працу, памер якой вызначаецца Агульным сходам.

36. Кантрольная Камісія БХК складаецца з трох сяброў, якія выбіраюцца Агульным сходам на 2 гады.

37. На першым пасяджэнні сябры Кантрольнай Камісіі выбіраюць старшыню, які кіруе яе працай.

38. Кантрольная Камісія:
-- кантралюе выкананне Статута сябрамі БХК;
-- кантралюе фінансавую дзейнасць БХК, правярае пакваратльныя і штогадовыя фінансавыя справаздачы;
-- кантралюе выкарыстанне маёмасці БХК, фінансавых сродкаў БХК, інфармуе аб гэтым Агульны сход не радзей 2-х разоў на год;
-- штогод робіць фінансавую справаздачу Агульнаму сходу.

39. Назіральны Сойм у складзе 9 чалавек з ліку прызнаных грамадскіх дзячоў Беларусі, а таксама іхні старшыня, выбіраецца Агульным сходам БХК на два гады.

40. Старшыня Назіральнага Сойму скликае сходы, якія, як правіла, збіраюцца напярэдадні Агульнага сходу.

41. Назіральны Сойм мае права:

-- абмяркоўваць пытанні выканання статутных мэтаў і задач Радай;

-- кантраляваць фінансавую дзейнасць БХК;

-- выступаць з кардынальнымі прапановамі на пасяджэннях Рады і Агульнага сходу;

-- прымаць рашэнні і пастановы, якія павінны абавязкова разглядаецца Радай і Агульным сходам БХК.

42. Старшыня Назіральнага Сойму мае права:

-- прадстаўляць БХК;

-- кантраляваць дзейнасць Старшыні БХК;

-- удзельнічаць у фарміраванні парадку дня пасяджэнняў Рады і Агульнага сходу БХК.

## У. Фінансавыя сродкі і маёмасць

43. Фінансавыя сродкі і маёмасць БХК складаюцца з:

-- добраахвотных ахвяраванняў;

-- дарункаў;

-- іншых паступленняў, не забароненых дзеючым заканадаўствам;

44. Грашовыя сродкі БХК захоўваюцца на банкаўскіх рахунках і выдаткоўваюцца на ўтрыманне штатных работнікаў, арэнду памяшканняў, транспарту, правядзенне мерапрыемстваў, прадугледжаных гэтым Статутам, на камандыровачныя, гаспадарчыя і канцылярскія выдаткі, а таксама на ўзнагароды за выкананую па заданнях Рады і Старшыні БХК працу, прэміраванні сяброў БХК за поспехі ў грамадскай дзейнасці.

45. Ва ўласнасці БХК могуць быць будынкі, збудаванні, памяшканні, выдавецтвы, абсталяванне, транспарт, камп"ютэрная тэхніка і іншая маёмасць, неабходная для матэрыяльнага забеспячэння дзейнасці БХК, прадугледжанай Статутам, за выключэннем аб"ектаў, якія згодна з законам могуць знаходзіцца толькі ва ўласнасці дзяржавы.

46. Правам падпісання фінансавых дакументаў надзяляюцца Старшыня БХК (у яго адсутнасці -- Сустаршыня) і бухгалтар.

47. Кантроль за выкарыстаннем грашовых сродкаў і маёмасці БХК ускладаецца на Кантрольную Камісію і Назіральны Сойм.

48. Беларускі Хельсінскі Камітэт не адказвае за абавязацельствы сваіх сяброў, сябры БХК не адказваюць за абавязацельствы Беларускага Хельсінскага Камітэту.

## УІ. Парадак унясення змяненняў і дапаўненняў у Статут

49. Статут БХК зацвярджаецца Агульным сходам БХК пры наяўнасці неменьш 2/3 сяброў са спісачнага складу большасцю ў 2/3 галасоў ад прысутных.

50. Змяненні і дапаўненні ў Статут уносяцца на разгляд Агульнага сходу па рашэнню Рады БХК ці Назіральнага Сойму.

51. Змяненні і дапаўненні ў Статут прымаюцца згодна п.п. 18, 20 дадзенага Статута.

## УП. Парадак рэарганізацыі і ліквідацыі

52. Дзейнасць БХК можа быць спыненая шляхам рэарганізацыі (зліцця, далучэння, раздзялення) або ліквідацыі толькі па рашэнні Агульнага сходу згодна п.п.18, 20 данага Статута, або судзе.

53. Пасля прыняцця рашэння аб ліквідацыі ствараецца Ліквідацыйная Камісія. Яны вызначае парадак выкарыстання ўласнасці БХК на мэты і задачы, прадугледжаныя гэтым Статутам.